Л.М.Грыцук

# АДМЕТНАСЦЬ РАМАНТЫЧНАЙ ЛІРЫКІ М.БАГДАНОВІЧА

Пачынаючы з часоў міфалогіі і гамераўскага эпасу і да нашых дзён у творчасці пісьменнікаў вельмі часта перапляталіся аб'ектыўныя і суб'ектыўныя пачаткі.

Сярод беларускіх пісьменнікаў, якія працавалі на пачатку XX стагоддзя, ёсць мастакі слова, якія аддаюць перавагу першаму пачатку, тым самым выяўляюць вернасць рэалістычнаму тыпу творчасці (Я.Колас, Ул.Галубок, Я.Купала і інш.). А іншыя схільныя да суб'ектыўнай трансфармацыі жыцця і, тым самым, бліжэй стаяць да рамантычнага тыпу творчасці.

Кожны з двух гэтых тыпаў творчасці (Л.І.Цімафееў) па-рознаму выяўляе сябе ў розныя гістарычныя эпохі. Другі, які яшчэ называюць нерэалістычным, шукае рамантыку жыцця,ператварае свет, паглыбляецца ў віртуальнасць. З крызісам палітычнай улады ўзрастае чуццё індывідуалізму, парушаецца ўнутраная гармонія свету, асобы, з'яўляецца матыў апакаліпсісу, смерці як безвыходнасці. Тады рэалістычны тып творчасці як бы саступае месца нерэалістычнаму: мадэрнісцкаму, постмадэрнісцкаму і – у пэўнай ступені – рамантычнаму як іх папярэдніку.

М.Багдановіч пісаў пасля першай рускай рэвалюцыі, калі выразна адчувалася разбурэнне былога расійскага ладу жыцця. Творчасць беларускага паэта ўвабрала ў сябе адзнакі літаратурных традыцый, напрацаваных ў Еўропе ў пачатку XX стагоддзя: і сімвалізму, і імпрэсіянізму, і, вядома, рэалізму. Расчараваны ў рэальным жыцці, незадаволены ім, паэт выкрывае яго супярэчлівасць і драматызм, супрацьпастаўляе рэчаіснасці свой эстэтычны ідэал. Гэты ідэал існуе ў душы героя, гэта яго мара, экзатычная і яркая казка:

І марылі астры ў цудоўнаму сне
Аб зёлках шаўковых, аб сонечным дне.
І казачны край падымаўся з іх сна,
Дзе кветкі не вянуць, дзе вечна вясна...[1,131]

Рамантызм Багдановіча абапіраецца на нацыянальна-культурную традыцыю. Пры маркотным будзёным цячэнні грамадскага жыцця, калі духоўны пачатак у чалавеку падаўлены, імкненне Багдановіча да рэальнага і ўзвышанага, духоўнага не знаходзіла задавальнення ў тым, што адбывалася вакол яго ў свеце. Рамантычныя тэндэнцыі ў паэзіі “Максіма-кніжніка” асабліва выразна выступаюць у лірыцы кахання. Пісьменнік ўзнёсла піша пра гэтае пачуццё, пра радасць, яго ахоплівае задавальненне ад таго, што людзі ў грамадстве не пакутуюць. Ад рэчаіснасці, якая не

спраўдзіла надзей паэта, Багдановіч уходзіць у свет інтымнага патаемнага, казачнага, віртуальнага:

Усё вышэй і вышэй я на гору ўзбіраўся,
Падымаўся да сонца, што дае нам цяпло:
Але толькі чым болей да яго набліжаўся,
Тым усё халадней мне й маркотней было. [1, 115]

Адметнасць рамантычных твораў Багдановіча заключаецца ў тым што рэалістычныя замалёўкі ён напаўняе міфалагічнымі вобразамі, дае кароткія, як у імпрэсіяністаў, імгненныя апісанні з'яў. Нерэалістычны свет дапамагае паэту раскрыць зацікаўленаму чытачу наваколле па-іншаму, зазірнуць у яго патаемныя куточкі. У творах паэта прысутнічае дух рамантычнага ідэалу, мэта якога - дапамагчы спасцігнуць сутнасць душы чалавека. Яшчэ з даўніх часоў міфалогія ў фантастычнай форме перадавала першабытныя назіранні чалавека над жыццём прыроды і грамадства, з'яўлялася вынікам народнай мудрасці. Рамантызм Багдановіча звязаны з прыродай, якая сама – казка, міф, а таму праз з'явы прыроды паэт глыбей апісвае чалавечыя пачуцці:

У небе - ля хмары грымотнай – празрыстая, легкая хмара
Шпарка плыла, і абедзве чагось чырванелі ад жару.
Зліцца жадалі яны, зрабіліся б хмарай магутнай,
Але далёка іх вецер разнёс, наляцеўшы нячутна.[1,35]

Такім чынам, у лірыцы Максіма Багдановіча знаходзім рысы рамантычнага тыпу творчасці:

- аўтар супрацьпастаўляе суровай рэчаіснасці ўзвышанага героя;
- на нейкія моманты паэт як бы ўцякае ад сучаснасці ў свет пачуццяў, у свет кахання, мары;
- лірыка паэта мае двупланавы характар, паказвае быццё як бы ў двух люстэрках: адно – казачна-фантастычнае, другое – рэальнае;
- выкарыстоўвае такія мастацкія прыёмы, як антытэза, гіпербала, гратэск, што ўласціва рамантычнаму і мадэрнісцкаму стылю пісьма ў большай ступені, чым рэалістычнаму;
- паэзія Багдановіча носіць узвышаны эмацыянальна-патэтычны стыль.

Нягледзячы на тое, што М.Багдановіч выступае як паэт-рамантык, ён спалучае ўзвышаныя мары з рэальнымі жыццёвымі праблемамі, аддаючы даніну павагі даўняй рэалістычнай традыцыі беларускай літаратуры.

1. М.Багдановіч. Збор твораў:у двух тамах.Том 1. – Мн.: Навука і тэхніка, 1968.